WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

21 КАСТРЫЧНІКА 2011 г. ПЯТНІЦА

№ 201 (27065)

Кошт 800 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

## Уначы падмарозіць да мінус 7, а раніцай — туман

**Напрыканцы тыдня ўслед за атмасферным фронтам на тэрыторыю Беларусі пачне зацягвацца больш халоднае паветра з боку Балтыйскага мора, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Вольга ФЯДОТАВА.**

Удзень у пятніцу чакаецца 4—10 цяпла. А вось на выхадныя да нас завітае заходне-еўрапейскі антыцыклон. Атмасферны фон павялічыцца, таму ападкаў не будзе. Уначы і раніцай месцамі даволі сур'ёзны туман. Уначы на суботу ад мінус 5 да плюс 2, на тарфяніках Палесся — замаразкі да мінус 7, удзень 4—10 цяпла. Уначы на нядзелю стане крыху цяплей — 0 — плюс 5, аднак месцамі ў Брэсцкай і Гомельскай абласцях да 1—5 марозу. Удзень даволі камфортна і сонечна — 6—12 цяпла.

У першыя дні наступнага тыдня захаваецца сухое кастрычніцкае надвор'е. Уначы будзе ад мінус 3 да 4 цяпла, пры праясненнях — да 6 марозу, удзень — 3—10 цяпла. У суботу і нядзелю ўначы ў Мінску каля 0.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ЛІЧЫЦЬ КАСМІЧНУЮ ПРАМЫСЛОВАСЦЬ АДНЫМ З НАЙБОЛЬШ ПЕРСПЕКТЫЎНЫХ НАПРАМКАЎ РАЗВІЦЦЯ ЭКАНОМІКІ

**ПРЭЗІДЭНТ Беларусі Аляксандр Лукашэнка лічыць касмічную прамысловасць адным з найбольш перспектыўных і важных напрамкаў развіцця эканомікі. Сёння можна смела сцвярджаць, што ў Беларусі яна стала паўнацэннай галіной народнай гаспадаркі. Аб гэтым ішла размова 20 кастрычніка ў ходзе наведвання кіраўніком дзяржавы ААТ «Пеленг».**



Фота БЕЛТА.

Прэзідэнт падкрэсліў, што ў будучым неабходна накіроўваць сродкі на развіццё найбольш перспектыўных праектаў, арыентаваных на імпартазамяшчэнне і экспарт. Кіраўнік дзяржавы закрануў тэму абнаўлення кадраў. На яго думку, у гэтым пытанні неабходна аддаваць прыярытэт тым, хто можа, выкарыстоўваючы сучасныя падыходы ў менеджменце, эфектыўна кіраваць прадпрыемствам. «Так званы крызіс стаў своеасаблівым паказчыкам здольнасці кіраўнікоў эфектыўна кіраваць прадпрыемствамі, і мы павінны ў гэтых адносінах зрабіць вывады», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Ён лічыць неабходным паступова скарачаць аб'ёмы дзяржпадтрымкі прадпрыемстваў навуковага і абароннага сектара эканомікі. «Цяпер мы дэталёва будзем разбірацца, чаму грошы раздадзены, а няма аддачы па імпартазамяшчэнні», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандру Лукашэнку прадэманстравалі інавацыйную і імпартазамяшчальную тэхніку, якую распрацоўваюць і вырабляюць арганізацыі Дзяржкамваенпрама і Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. У прыватнасці, Прэзідэнт азнаёміўся з поўнапрывадным лёгкабраніраваным аўтамабілем аператыўнага рэагавання «Барс», а таксама самаходным процітанкавым комплексам «Ацэлот». У іх вытворчасці выкарыстана сучасная палімерна-кампазітная браня, а таксама сучасны кампазітны процірадыёлакацыйны матэрыял. Увазе Аляксандра Лукашэнкі таксама былі прадстаўлены пераносны процітанкавы ракетны комплекс «Шэршань», розныя віды беспілотных лятальных апаратаў, платформа на базе шасі беларускай вытворчасці для размяшчэння розных узораў узбраення і ваеннай тэхнікі, уніфікаваная камандна-штабная машына і комплексная апаратная сувязі, распрацоўкі ў галіне абароны баявых самалётаў, новыя сродкі радыёэлектроннай барацьбы і аптычнай разведкі. Як далажылі Прэзідэнту, у Беларусі год ад году расце доля высокатэхналагічнай і навукаёмістай прадукцыі, а ўсе прадстаўленыя ўзоры карыстаюцца высокім попытам за мяжой.

СТАР. 2

## ДЭВАЛЬВАЦЫЯ БЕЛАРУСКАГА РУБЛЯ НЕ ПРЫВЯДЗЕ ДА АЎТАМАТЫЧНАГА РОСТУ ЦЭН

**ДЭВАЛЬВАЦЫЯ беларускага рубля 20 кастрычніка не прывядзе да аўтаматычнага росту цэн. Аб гэтым заявіў віцэ-прэм'ер Сяргей РУМАС на пасяджэнні Нацыянальнага савета па працоўных і сацыяльных пытаннях, перадае БЕЛТА.**

«Не думаю, што з чарговай дэвальвацыяй беларускага рубля адбудзецца аўтаматычнае змяненне цэн», — сказаў Сяргей Румас. Ён удакладніў, што большасць тавараў і паслуг ужо змяшчае курс, які склаўся на дадатковай сесіі. У той жа час ёсць пэўныя віды тавараў, паслуг, якія звязаны непасрэдна з афіцыйным курсам беларускага рубля. Гэта датычыцца энерганосьбітаў, часткі лекаў. «Там магчыма карэкцыя цэн», — адзначыў віцэ-прэм'ер. Ён таксама паведаміў, што **да канца года чакаецца яшчэ адно павышэнне цэн на бензін.** «Гэта было не апошняе павышэнне цэн на бензін, да канца года яшчэ раз давядзецца павышаць цэны, калі мы хочам ездзіць, а не хадзіць пешшу».

Паводле яго слоў, чым больш у бягучым годзе будуць выраўновацца цэны, тым лягчэй «нам будзе ў наступным годзе стабілізаваць сітуацыю і выйсці на той узровень інфляцыі, які ўстанавіў урад у прагнозе — 19 працэнтаў, не больш». Віцэ-прэм'ер таксама папрасіў улічваць той факт, што інфляцыя ў 2011 годзе мае ў пераважнай большасці манетарную прыроду. «Спадзяюся, што ўмацаванне курсу беларускага рубля, якое будзе ў канцы года, таксама дасць магчымасць прытармазіць інфляцыю па некаторых таварных пазіцыях, а па шэрагу пазіцый яна можа развярнуцца назад».

### За паслугі ЖКГ давядзецца плаціць па поўнай

Узровень пакрыцця насельніцтвам затрат на паслугі ЖКГ будзе ўзрастаць на 10 працэнтаў у год.

«Мы да канца года павінны выйсці на 30 працэнтаў кампенсацыі кошту паслуг ЖКГ, у наступным годзе — на 35-40 працэнтаў», — сказаў віцэ-прэм'ер. Сёння насельніцтва аплачвае 20,8 працэнта кошту паслуг ЖКГ, усё астатняе даплачвае дзяржава.

«Але каб не па ўсіх адначасова біла гэта павышэнне, трэба неяк засцерагчы ад яго малазабяспечаныя пласты насельніцтва», — адзначыў віцэ-прэм'ер. З гэтай мэтай і было прынята рашэнне аб нарміраванні асобных відаў паслуг. Так, нядаўна ў Беларусі ўведзены абмежаванні на спажыванне вады — 140 л на чалавека ў суткі будзе аплачвацца па сацыяльных цэнах, усё, што звыш, — па сабекошце. Пры гэтым віцэ-прэм'ер удакладніў, што сярэдняе спажыванне вады ў краіне складае прыкладна 145 л на чалавека. «Таму той, хто хоча мыцца часцей, павінен за гэта плаціць, а не дзяржава», — рэзюмаваў ён. Ён таксама канстатаваў, што сёння забяспечаныя людзі больш спажываюць паслуг ЖКГ, чым малазабяспечаныя. «Багатая сям'я мае некалькі тэлевізараў, кандыцыянераў, адпаведна і спажыванне электраэнергіі большае», — сказаў ён.

**Наступным этапам па ўвядзенні нарміравання на асобныя віды паслуг будзе электраэнергія.** «Разглядаецца ўвядзенне нарміравання на электрычную энергію, што таксама прымусіць людзей выходзячы, выключаць святло, а не 20 працэнтаў плаціць чалавеку, а 80 працэнтаў — датацыі дзяржавы». Сяргей Румас пры гэтым падкрэсліў, што ўрад і далей будзе працягваць сацыяльную палітыку абароны малазабяспечаных слаёў насельніцтва. **Плануецца зноў вярнуцца да жыллёвых субсідый.** Сям'я, у даходзе якой паслугі ЖКГ складаюць больш як 20 працэнтаў, можа прэтэндаваць на атрыманне субсідый з боку дзяржавы.

### Нельга дапусціць узнікнення спіралі «інфляцыя — дэвальвацыя»

Для выхаду з існуючай эканамічнай сітуацыі дзяржава не будзе аказваць падтрымку ўсім і ўся, заявіў Сяргей Румас. Віцэ-прэм'ер падкрэсліў, што далей дзяржава не зможа аказваць такую ж падтрымку, як гэта было раней. «Тут мы сёння бачым, што перабралі меру з аказаннем дзяржпадтрымкі, — сказаў ён. — У нас большасць сядзела на дзяржпадтрымцы, таму далей урад не будзе за кожным хадзіць з лыжкай». У той жа час, падкрэсліў Сяргей Румас, у праекце сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на наступны год, а таксама на бліжэйшыя тры гады **прадугледжваюцца больш ільготныя ўмовы для развіцця бізнэсу.** Ва ўмовах Адзінай эканамічнай прасторы гэта неабходна зрабіць. «Мы пачынаем жыць у новых рэаліях — у складзе трох краін будуем Адзіную эканамічную прастору», — канстатаваў віцэ-прэм'ер. Ён паведаміў, што ўчора ў Санкт-Пецярбургу праходзілі інтэграцыйныя мерапрыемствы, якія датычыліся фарміравання АЭП. «Мы адстаём у гэтым працэсе, Расія, нават Казахстан сёння стварылі значна лепшыя ўмовы для бізнэсу», — прызнаў ён.

СТАР. 2

## Адзіны курс — Br8680 за $1

*«Натуральна, што цэны на імпартныя медыцынскія прэпараты пасля ўсталявання новага афіцыйнага курсу павялічацца...»*

**ПРА гэта заявіла старшыня праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Надзея ЕРМАКОВА, адказваючы на пытанне карэспандэнта «Звязды». «Я думаю, што ў цэны на медыцынскія прэпараты, якія знаходзяцца ў аптэках, былі ўжо закладзены рынкавыя курсы, хоць большасць з іх куплялася, зразумела, за валюту па афіцыйным курсе, — сказала кіраўнік Нацбанка. — Таму, зразумела, яны падаражэюць». Аднак для некаторых слаёў насельніцтва ўрадам будуць прадугледжаны льготы, асабліва для тых, у каго ёсць хранічныя захворванні, хто пастаянна павінен прымаць прэпараты.**

Учора на Беларускай валютна-фондавай біржы быў усталяваны адзіны курс беларускага рубля. Нацбанк пераходзіць да рэжыму «кіраванага плавання» курсу нацыянальнай валюты. Курс будзе вызначацца на падставе попыту і прапановы з мінімальнымі інтэрвенцыямі Нацыянальнага банка, накіраванымі выключна на абмежаванне рэзкіх (каля 5-10 працэнтаў) ваганняў курсу. Дарэчы, «рэгуляванае плаванне» будзе, напэўна, доўгатэрміновым захадам: «Ад яго мы зможам адмовіцца, толькі калі прыток валюты ў краіну стане нашмат большым за адток», — патлумачыла старшыня Нацбанка. Для інтэрвенцый першы банк краіны плануе выкарыстоўваць прамежкава зробленыя грошы. Надзея Ермакова спадзяецца, што да канца года не прыйдзецца «ўлазіць у золатавалютны запас». Аднак калі што — 4,5 млрд золатавалютных рэзерваў ёсць ужо сёння. Да канца года запланавана атрымаць яшчэ 2,5 млрд долараў ад продажу «Белтрансгаза», 1 млрд — ад Ашчадбанка Расіі, 440 млн — ад антыкрызіснага фонду ЕўрАзЭС. Разам з новым афіцыйным курсам прыйдзе і шмат іншых падзей. Напрыклад, вырастуць цэны на энерганосьбіты.

*«За кастрычнік разлікі за энерганосьбіты пойдуць па новым курсе»,*

— паведаміла Надзея Ермакова. — Што тычыцца ўплыву дэвальвацыі (між іншым, яна склала 189 працэнтаў з пачатку года, — **аўт.**) на жыллёва-камунальныя паслугі для насельніцтва, то трэба сказаць, што цана гэтых паслуг залежыць не толькі ад кошту энерганосьбітаў, але і ад таго, якую частку дзяржава бярэ на сябе. Пакуль нейкіх канкрэтных лічбаў я не магу сказаць, рашэнне будзе прымаць урад. Аднак мяркуецца, што цана на гэтыя паслугі да канца года будзе павышана».

СТАР. 2

## Трагедыя

## ВЕРТАЛЁТ ДЗЯРЖПАГРАНКАМІТЭТА РАЗБІЎСЯ Ў ЛЕСАПАЛАСЕ Ў ПАСТАЎСКІМ РАЁНЕ: ЗАГІНУЛА ПЯЦЬ ЧАЛАВЕК

**Верталёт французскай кампаніі Ecureuil AS 355 NP Дзяржаўнага пагранічнага камітэта разбіўся ў лесапаласе ў Пастаўскім раёне. У катастрофе загінула пяць чалавек. Пра гэта БЕЛТА паведаміў прэс-сакратар Дзяржпагранкамітэта Беларусі Аляксандр Цішчанка.**

«Учора, прыкладна ў 15.45, у раёне вёскі Вілейты за кіламетр ад мяжы пацярпеў крушэнне верталёт органаў пагранічнай службы Ecureuil AS 355 NP. Верталёт выконваў заданне па ахове мяжы. На борце знаходзіліся два члены экіпажа і здымачная група, якая рыхтавала спецыяльны рэпартаж. Верталёт упаў і загарэўся. Усе загінулі. Цяпер працуе спецкамісія, праводзяцца ўсе неабходныя мерапрыемствы, прадугледжаныя ў такіх выпадках», — расказаў Аляксандр Цішчанка.

Палёт быў планавы. У склад здымачнай групы ўваходзілі Шатырнік Юлія Мікалаеўна, Пракчаўскі Віталь Русланавіч, Шамалаў Сяргей Міхайлавіч.

Дзяржпагранкамітэт выказвае спачуванні родным і блізкім загінулых.

**ПА ВЫНІКАХ ПЕРШАГА ДНЯ ПРАЦЫ АДЗІНАЙ СЕСІІ БЕЛАРУСКАЙ ВАЛЮТНА-ФОНДАВАЙ БІРЖЫ ЎСТАЛЯВАЛІСЯ НАСТУПНЫЯ КУРСЫ АСНОЎНЫХ ВАЛЮТ:**

Долар ЗША — 8680 беларускіх рублёў;
Еўра — 11900 беларускіх рублёў;
Расійскі рубель — 277 беларускіх рублёў.
*Гэтыя курсы з'яўляюцца афіцыйнымі на 21 кастрычніка 2011 года.*

**КУРСЫ НЕКАТОРЫХ БАНКАЎ НА 20 КАСТРЫЧНІКА:**

**«Беларусбанк»:** долар ЗША — 8250 і 8700; еўра — 11300 і 11900; расійскі рубель — 260 і 277.

**«Тэхнабанк»:** долар ЗША — 8220 і 8580; еўра — 11350 і 11750; расійскі рубель — 263 і 275.

**«Белрасбанк»:** долар ЗША — 8000 і 9000; еўра — 10900 і 12400; расійскі рубель — 250 і 295.

## БЕЛАРУСЬ ПАДНЯЛАСЯ НА 22 ПАЗІЦЫІ Ў РЭЙТЫНГУ «DOING BUSINESS 2012»

**У апублікаваным учора рэйтынгу Сусветнага банка і Міжнароднай фінансавай карпарацыі «Вядзенне бізнэсу-2012» Беларусь заняла 69 месца сярод 183 краін свету. У гэтым жа рэйтынгу за мінулы год наша краіна стаяла на 68 месцы, але зараз аўтары даклада «Doing Business» перагледзелі метадалогію вызначэння двух паказчыкаў рэйтынгу, дадалі новы паказчык «Падключэнне да сістэмы электразабеспячэння» і пералічылі рэйтынгі краін. Такім чынам, у адпаведнасці з новай рэдакцыяй, Беларусь у рэйтынгу «Вядзенне бізнэсу-2011» заняла 91-е месца. Што на цэлых 22 пазіцыі ніжэй, чым зараз.**

СТАР. 2

## АМБАСАДАР БЕЛАРУСІ



**Помнік Уладзіміру Караткевічу ўсталяваны ў Кіеве**

**ЁН нібыта толькі што выйшаў з беларускай амбасады, не паспеўшы зашпіліць паліто, у світары і кепачцы і з лёгкай усмешкай. І нібыта быў заспеты нечаканым зваротам — магчыма, хтосьці спытаў пра ягоныя кнігі. А ён у адказ: яны самі пра сябе раскажуць. Так і ёсць, калі іх чытаеш, то разумееш, што Караткевіч жывы ў сваіх словах і праз кнігі прадстаўляе Беларусь у свеце. Кніга, старонкі якой змяшчаюць словы Караткевіча, раскажа пра яго радзіму, пра народ, які пачаў шлях да сваёй уласнай краіны, і пра аўтара, які гэты шлях прайшоў праз розныя ўніверсітэты лёсу.**

І трэба было юнаку Уладзіміру з беларускай Оршы паступіць у Кіеў, пайсці ў «людзі», каб зразумець, што яны хоць і блізкія, але ўсё ж іншыя, з мовай асаблівай, пявучай... але ж і яго родная мова гучыць прыгожа, асабліва калі ідзе ад самага сэрца.

І там, у Кіеве, асаблівым спевам пачаў гучаць у яго сэрцы родны матыў, які ён вынес з хаты сваіх бацькоў, умацаваўся і загучаў аднойчы магутным гімнам, да якога самі сабой сталі знаходзіцца словы любові да «зямлі пад белымі крыламі».

— Уладзімір Караткевіч — асоба, якая злучае Беларусь і Украіну. Ён скончыў Кіеўскі нацыянальны ўніверсітэт, быў настаўнікам на кіеўшчыне, яго першыя творы, вершы з'явіліся на кіеўскай зямлі. Выдатны твор «Зямля пад белымі крыламі», дзе ён услáвіў Беларусь, быў напісаны ва Украіне. Ён у сваёй творчасці паказаў любоў да сваёй роднай зямлі, свайго народа, ён адзін з першых падкрэсліваў, што беларусы — гэта нацыя, нацыя з еўрапейскімі каранямі, што яны маюць права на сваю незалежнасць, на сваю дзяржаўнасць. Ён бы вельмі радаваўся, што Беларусь і Украіна — сёння незалежныя краіны, якія развіваюць адносіны ў розных сферах, — адзначыў **міністр культуры Беларусі Павел ЛАТУШКА.** — Але яго словы неаднойчы гучалі з любоўю да Украіны, да Кіева. Як беларус я ганаруся, што мы ўшанавалі класіка беларускай культуры. Усталяванне помніка — вельмі важны жэст украінскага грамадства, кіраўніцтва Украіны ў дачыненні да беларускай культуры. Спадзяюся, што помнікі, памятныя дошкі ў гонар дзеячаў беларускай культуры будуць з'яўляцца ў нашых суседзяў. Мы таксама адкрытыя, каб ушаноўваць памяць прадстаўнікоў гэтых народаў у Беларусі. Трэба шанаваць тое, што нас аб'ядноўвае.

СТАР. 6

БЕЛВНЕШЭКОНОМБАНК

ТРАДИЦИИ НАДЕЖНОСТЬ КОМПЕТЕНТНОСТЬ

ОАО «Белвнешэкономбанк»
г. Минск, ул. Мясникова, 32

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2011 года**

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | на 01.10.2011 г. | на 01.10.2010 г. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 162 574,6 | 70 407,3 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | 279,5 | 2 385,2 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 2 330 453,5 | 263 269,9 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 1 223 662,8 | 215 662,5 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 260 750,3 | 269 984,5 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 4 393 648,5 | 1 750 454,0 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 50 751,0 | 325,1 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 8 990,0 | 7 490,1 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 108 147,2 | 84 479,4 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 1,2 | 707,4 |
| 12 | Прочие активы | 1111 | 123 843,8 | 24 957,1 |
| 13 | ИТОГО активы | 11 | 8 663 102,4 | 2 690 122,5 |
| 14 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 15 | Средства Национального банка | 1201 | 1 175 721,2 | 118 366,0 |
| 16 | Средства банков | 1202 | 3 785 905,0 | 561 854,3 |
| 17 | Средства клиентов | 1203 | 2 565 679,3 | 1 181 372,7 |
| 18 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | - | 726,2 |
| 19 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 38 672,5 | 4 003,5 |
| 20 | Прочие обязательства | 1206 | 86 223,4 | 32 908,9 |
| 21 | ВСЕГО обязательства | 120 | 7 652 201,4 | 1 899 231,6 |
| 22 | **КАПИТАЛ** | | | |
| 23 | Уставный фонд | 1211 | 758 464,0 | 605 017,0 |
| 24 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 25 | Резервный фонд | 1213 | 36 757,2 | 30 584,0 |
| 26 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 63 946,9 | 58 252,6 |
| 27 | Накопленная прибыль | 1215 | 151 732,9 | 97 037,3 |
| 28 | ВСЕГО капитал | 121 | 1 010 901,0 | 790 890,9 |
| 29 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | 8 663 102,4 | 2 690 122,5 |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 октября 2011 года**

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | на 01.10.2011 г. | на 01.10.2010 г. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 464 422,3 | 203 324,7 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 216 275,6 | 68 659,1 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 248 146,7 | 134 665,6 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 83 199,0 | 50 495,3 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 26 735,5 | 7 389,1 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 56 463,5 | 43 106,2 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | 2 934,6 | 504,8 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 322,3 | 70,6 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 146 410,2 | 20 936,8 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | (23 173,7) | (2 516,8) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 178 370,9 | 32 933,5 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 10 266,1 | 7 099,5 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 149 297,9 | 96 615,7 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 20 087,0 | 11 711,0 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 93 613,9 | 62 606,5 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | 11 576,4 | 10 561,6 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 82 037,5 | 52 044,9 |

**Председатель Правления** **П.В. Каллаур**

**Главный бухгалтер** **З.С. Кушнерова**

Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности № 6 от 27.10.2006. УНП 100010078.

БАНК ТОРГОВЫЙ КАПИТАЛ

Закрытое акционерное общество

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2011 г.**

ЗАО «ТКБанк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2011 | 01.10.2010 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 12 834,4 | 5 702,8 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 32 122,1 | 58 720,1 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 1 190 575,3 | 459 090,5 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 32 754,1 | 98 036,1 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 181 599,4 | 28 800,6 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 246 919,8 | 7 536,4 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 11 378,1 | 10 175,8 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | - | - |
| 12 | Прочие активы | 1111 | 169 504,4 | 40 596,9 |
| 13 | ИТОГО активы | 11 | 1 877 687,6 | 708 659,2 |
| 14 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 15 | Средства Национального банка | 1201 | 9,0 | - |
| 16 | Средства банков | 1202 | 1 023 981,9 | 560 136,8 |
| 17 | Средства клиентов | 1203 | 186 877,5 | 21 785,4 |
| 18 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | - | - |
| 19 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | 2 644,9 |
| 20 | Прочие обязательства | 1206 | 15 790,6 | 9 223,3 |
| 21 | ВСЕГО обязательства | 120 | 1 226 659,0 | 593 790,4 |
| 22 | **КАПИТАЛ** | | | |
| 23 | Уставный фонд | 1211 | 616 504,9 | 110 588,2 |
| 24 | Эмиссионный доход | 1212 | 167,6 | 167,6 |
| 25 | Резервный фонд | 1213 | 13 108,6 | 1 346,1 |
| 26 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | (475,6) | 0,2 |
| 27 | Накопленная прибыль | 1215 | 21 723,1 | 2 766,7 |
| 28 | ВСЕГО капитал | 121 | 651 028,6 | 114 868,8 |
| 29 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | 1 877 687,6 | 708 659,2 |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 октября 2011 г.**

ЗАО «ТКБанк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2011 | 01.10.2010 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 56 013,5 | 27 876,1 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 19 198,3 | 9 136,4 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 36 815,2 | 18 739,7 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 10 519,8 | 871,8 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 1 174,6 | 439,9 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 9 345,2 | 431,9 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | (904,5) | 1 588,0 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | (337 925,8) | (1 672,4) |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 415 977,1 | (2 030,0) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 87 067,7 | 7 571,7 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 1 895,7 | 18,6 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 16 010,9 | 6 613,0 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 551,2 | 274,4 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 21 573,1 | 2 616,7 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | - | - |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 21 573,1 | 2 616,7 |

**Председатель Правления** **А.Б. Веретельников**

**Главный бухгалтер** **И.Л. Бурко**

**17 октября 2011 г.**

Лицензия НБ РБ на осуществление банковской деятельности № 30 от 29.06.2011 г. УНП 807000163.

ISSN 1990 - 763X

*КУРСЫ ЗАМЕЖНЫХ ВАЛЮТ, УСТАНОЎЛЕНЫЯ НБ РБ з 21.10.2011 г. (ДЛЯ Б/Н РАЗЛІКАЎ)*

| | |
|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША ......... 8 680,00 | 1 чэшская крона ......... 479,20 |
| ▲ 1 еўра ......... 11 900,00 | 1 польскі злоты ......... 2 738,78 |
| 1 латвійскі лат ......... 16 915,13 | ▲ 1 расійскі рубель ......... 277,00 |
| 1 літоўскі літ ......... 3 454,59 | 1 украінская грыўня ......... 1 084,93 |

*КУРСЫ ЗАМЕЖНЫХ ВАЛЮТ ДЛЯ БЕЗНАЯЎНЫХ РАЗЛІКАЎ ЦЭНТРАБАНК РФ*

| | |
|---|---|
| USD | 31,3788 |
| 10 UAH | 39,2260 |
| 10000 BYR | 54,9349 |
| EUR | 42,9858 |

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА І ДЗМІТРЫЙ МЯДЗВЕДЗЕЎ МОГУЦЬ У ЛІСТАПАДЗЕ ПАДПІСАЦЬ НОВЫЯ КАНТРАКТЫ НА НАФЦЕ І ГАЗУ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і Прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў могуць у лістападзе падпісаць новыя кантракты на нафце і газ. Аб гэтым заявіў 19 кастрычніка журналістам прэм'ер-міністр Расіі Уладзімір Пуцін, перадае БЕЛТА.**

«Работа практычна завершана, і трэба паставіць апошнюю кропку адносна цэнавых паказчыкаў. Яна будзе пастаўлена прэзідэнтамі на сустрэчы, якая запланавана на лістапад», — сказаў Уладзімір Пуцін. Пры гэтым ён падкрэсліў, што сур'ёзная работа па гэтых дакументах праведзена на ўзроўні экспертаў і ўрадаў. Дзейны кантракт «Газпрама» і «Белтрансгаза» на пастаўку і транзіт газу заканчваецца ў канцы снежня гэтага года.

## УЛАДЗІМІР ПУЦІН ПАДЗЯЛЯЕ ПАЗІЦЫІ АЛЯКСАНДРА ЛУКАШЭНКІ ПА ПЫТАННЯХ ІНТЭГРАЦЫІ Ў МЫТНЫМ САЮЗЕ

**Кіраўнік урада Расіі Уладзімір Пуцін падтрымлівае пазіцыі Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі, выкладзеныя ў газеце «Известия», па пытаннях інтэграцыі ў Мытным саюзе. Аб гэтым Уладзімір Пуцін заявіў 19 кастрычніка на прэс-канферэнцыі ў Санкт-Пецярбургу, перадае БЕЛТА.**

Прэм'ер-міністр Расіі, у прыватнасці, адзначыў, што згодны з тым, што інтэграцыйныя працэсы не звязаны з унутрыпалітычнай сітуацыяй у Расіі і Беларусі. «Я чытаў артыкул. Ён мне вельмі спадабаўся, — сказаў Уладзімір Пуцін. — Гэта яшчэ раз пацвярджае настрой беларускай дзяржавы, кіраўніцтва Беларусі на развіццё інтэграцыйных працэсаў на постсавецкай прасторы». Прэм'ер-міністр Расіі дадаў, што Аляксандр Лукашэнка дакладна паказаў эканамічныя перавагі інтэграцыі. Кіраўнік расійскага ўрада з такім аналізам поўнасцю згодны. «Згодны таксама і з тым, што гэтыя працэсы не маюць нічога агульнага з бягучай палітычнай кан'юнктурай у нашых краінах, у тым ліку і з палітычнай кан'юнктурай у Расіі, маю на ўвазе передвыбарную сітуацыю», — адзначыў ён. Уладзімір Пуцін падкрэсліў, што толькі аб'яднанне дзяржаў на роўных правах і ўмовах можа прывесці да таго, што ўсе яны будуць працаваць з поўнай аддачай.

## 500 ТЫСЯЧ ДОЛАРАЎ — САМЫ БУЙНЫ ХАБАР, ВЫЯЎЛЕНЫ Ў БЕЛАРУСІ

**Пра гэта ўчора журналістам паведаміў выканаўца абавязкаў начальніка ўпраўлення па барацьбе з карупцыяй і арганізаванай злачыннасцю Генпракуратуры Беларусі Ігар ГРЭЙБА.**

— Аднойчы быў выяўлены выпадак атрымання хабару ў памеры 500 тысяч долараў, — адзначыў Ігар Грэйба. — Гэта было год-два таму. У цэлым жа сярэдні памер хабару па краіне вар'іруецца ад 200 да 300 долараў. Ён залежыць ад месца працы службовай асобы, шырыні яго паўнамоцтваў.

Пры гэтым у сістэме адукацыі ў асноўным атрымліваюць хабар пры прыёме іспытаў і залікаў, за напісанне дыпломных і курсавых работ; службовыя асобы праваахоўных органаў — за непрыцягненне да крымінальнай адказнасці, за датэрміновае вяртанне пасведчанняў кіроўцы. Службовыя асобы кантралюючых органаў «бяруць на лапу» за спагнанне падаткаў не ў поўным аб'ёме, за вызваленне ад прыцягнення да адміністрацыйнай адказнасці; у сферы аховы здароўя распаўсюджаны хабар за выдачу бальнічных лісткоў.

Паводле слоў Ігара Грэйбы, колькасць карупцыйных злачынстваў, здзейсненых праваахоўнымі органамі, з кожным годам змяншаецца.

— Але, на жаль, такія факты маюць месца. Так, сёлета на рахунку службовых асоб Міністэрства ўнутраных спраў 41 карупцыйнае злачынства, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях — 4, Міністэрства па падатках і зборах — 5, органаў пракуратуры — 4 (усе яны здзейсненыя летась, але сёлета скончана іх расследаванне), Камітэта дзяржаўнай бяспекі — 1, Мытнага камітэта — 18 , Дэпартамента фінансавых расследаванняў — 6 злачынстваў.

На пытанне, дзе зараз знаходзіцца экс-пракурор Мінскай вобласці, якога ў маі мінулага года асудзілі ў тым ліку і за атрыманне хабару, **начальнік аддзела па наглядзе за аператыўна-вышуковай дзейнасцю і расследаваннем спраў аб карупцыі Генпракуратуры Дзмітрый КАСЦЮКЕВІЧ** адказаў:

— Міхаіл Снягір адбывае пакаранне ў папраўчай калоніі ўзмоцненага рэжыму ў Шклове. Ён адбывае тэрмін заключэння ў адпаведнасці з прысудам (суд прыгаварыў яго да 7 гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй усёй маёмасці, а таксама пазбаўленнем права займаць пасады на дзяржаўнай службе на працягу пяці гадоў і пазбаўленнем чына дзяржаўнага саветніка юстыцыі 3-га класа), мае магчымасць сустрэч са сваякамі.

За 9 месяцаў 2011 года колькасць выяўленых карупцыйных злачынстваў у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года зменшылася на 5, 7 % — з 2280 да 2151. Найбольшая іх колькасць выяўлена ў сферах прамысловасці, дзяржаўнага кіравання, гандлю, будаўніцтва, аховы здароўя, сельскай гаспадаркі і адукацыі. Да крымінальнай адказнасці прыцягнутыя 422 асобы.

— Нягледзячы на зніжэнне агульнай колькасці зарэгістраваных злачынстваў, памер матэрыяльнага ўрону, нанесенага такімі злачынствамі, сёлета ў параўнанні з мінулым годам крыху павялічыўся, — адзначыў падчас свайго выступлення Ігар Грэйба. — Пры ўсім пры гэтым сёлета дзяржаве кампенсавана нанесеная матэрыяльная шкода на агульную суму больш чым 34,7 млрд рублёў, што на 60 % больш, чым летась.

Што тычыцца геаграфіі распаўсюджання карупцыйных злачынстваў, найбольшая іх колькасць за 9 месяцаў гэтага года зафіксавана ў Гомельскай вобласці — 399. Для параўнання: у горадзе Мінску — 348, Магілёўскай вобласці — 316, у Мінскай — 299, Гродзенскай — 241.

У Генпракуратуры лічаць, што наспеў час укараніць кодэксы этыкі дзяржаўных служачых, якія б спрыялі барацьбе з карупцыяй. А таксама ўдасканаліць дзейнае заканадаўства аб дэклараванні даходаў і маёмасці дзяржаўнымі служачымі, якое яшчэ не ў поўнай меры дазваляе эфектыўна супрацьдзейнічаць карупцыйным правапарушэнням. У прыватнасці, Генпракуратура прапаноўвае пашырыць пералік звестак, якія павінны дэклараваццa дзяржаўнымі служачымі, дзейнасць якіх найбольш схільная да карупцыі, увесці абавязковае адкрытае апублікаванне гэтых звестак з дэкларацый аб даходах і маёмасці дзяржаўных служачых, якія займаюць найбольш высокія пасады.

## БЫЛЫ ГЕНДЫРЭКТАР «ПІНСКДРЭВА» ЗНАХОДЗІЦЦА Ў ВЫШУКУ

Паводле слоў **намесніка начальніка аддзела па расследаванні спраў аб карупцыі следчага ўпраўлення Генпракуратуры Генадзя БАРЫСАВА,** экс-дырэктар ЗАТ «Холдынгавая кампанія «Пінскдрэў» Ларан Арыніч знаходзіцца ў вышуку з 23 жніўня. А 22 верасня вынесена пастанова аб прымяненні ў дачыненні да яго меры стрымання ў выглядзе ўтрымання пад вартай.

— Зараз крымінальная справа па факце выбуху на прадпрыемстве «Пінскдрэў» 25 кастрычніка 2010 года знаходзіцца ў стадыі заканчэння (яе расследаваннем займаўся аддзел па расследаванні спраў аб карупцыі Генпракуратуры, бо справа тычыцца службовых асоб), — адзначыў Генадзь Барысаў. — З ёй ужо азнаёміліся пацярпелыя, знаёмяцца абвінавачаныя. Імі прызнаныя 4 чалавекі, у тым ліку два інжынеры і экс-дырэктар прадпрыемства. Трое прыцягнуты да адказнасці па артыкулах 428, 304 Крымінальнага кодэксу («службовая халатнасць» і «парушэнне правілаў пажарнай бяспекі»), Арыніч знаходзіцца ў вышуку.

Па гэтай крымінальнай справе 22 чалавекі прызнаны пацярпелымі: 14 загінулых (адразу пасля выбуху на месцы загінула 2 чалавекі, 12 у бальніцы), 8 траўмаваных.

— Нялёгка было расследаваць гэтую справу, бо пажар, які ўспыхнуў услед за выбухам, знішчыў усе сляды, — дадаў Генадзь Барысаў. — Давялося прызначаць вельмі шмат экспертыз, каб выявіць прычыну гэтага здарэння. Органы папярэдняга расследавання ўстанавілі асоб, якія могуць быць прызнаны вінаватымі ў здзяйсненні гэтага злачынства. Ступень іх віны вызначыць суд.

**Надзея ДРЫЛА.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### МУАМАР КАДАФІ ЗАГІНУЎ АД РАН

Муамар Кадафі загінуў — гэтая навіна нумар адзін у сусветных СМІ з'явілася ўдзень у чацвер. Спачатку да гэтых вестак, атрыманых ад лівійскіх паўстанцаў, паставіліся з вялікай доляй скепсісу — раней яны неаднаразова распаўсюджвалі інфармацыю пра паланенне ці смерць каго-небудзь са сваякоў Кадафі, якая потым не пацвярджалася. Але зараз сітуацыя прынцыпова іншая — СМІ паказваюць фотаздымкі і відэазапісы, на якіх, мяркуецца, выява скрываўленага цела звергнутага палкоўніка. Ён загінуў падчас штурму горада Сірт, афіцыйна пацвердзілі прадстаўнікі Пераходнай нацыянальнай рады Лівіі. Першы здымак на мабільны тэлефон зрабіў хтосьці з байцоў ПНР. Цела Муамара Кадафі ўжо дастаўлена з Сірта ў адну з мячэцяў горада Місурата, размешчанага ў 200 км на ўсход ад Трыпалі.

Першыя паведамленні пра лёс Кадафі былі вельмі супярэчлівымі. Адзін з прадстаўнікоў сіл ПНР заявіў, што падчас штурму горада Сірта палкоўнік быў паранены і захоплены ў палон, паведаміла брытанская The Guardian. Паводле гэтых звестак, Кадафі быў паранены ў абедзве нагі. Верагодна, ён хаваўся ў нейкай яме, паведамляе газета, адзначаючы, што, убачыўшы байцоў Нацыянальнай пераходнай рады, Кадафі закрычаў ім: «Не страляйце!» Паводле іншых звестак, яго захапілі, калі калона аўтамашын, у якой ён пакідаў Сірт, трапіла пад абстрэл спачатку авіяцыі НАТА, а затым лівійскіх паўстанцаў. Акрамя экс-лідара Лівіі, захоплены яго сын Мутасім, а таксама былы кіраўнік лівійскай службы разведкі Абдула ас-Сенусі, якія знаходзіліся з Кадафі.

Sky News са спасылкай на прадстаўніка НПР Абдэля Маджыда паведамляе, што пасля паланення палкоўніка павезла ў шпіталь карэта хуткай дапамогі. У яго былі вельмі сур'ёзныя раненні. «Інтэрфакс» піша, што Муамар Кадафі мог загінуць падчас авіяўдару двух самалётаў НАТА па канвоі машын прыхільнікаў звергнутага лівійскага лідара. Паводле непацверджаных звестак, Кадафі, які знаходзіўся ў адным з аўтамабіляў, атрымаў моцныя раненні падчас бамбардзіроўкі і памёр.

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ЛІЧЫЦЬ КАСМІЧНУЮ ПРАМЫСЛОВАСЦЬ АДНЫМ З НАЙБОЛЬШ ПЕРСПЕКТЫЎНЫХ НАПРАМКАЎ РАЗВІЦЦЯ ЭКАНОМІКІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аляксандр Лукашэнка акцэнтаваў увагу на неабходнасці павелічэння долі беларускага складніка ў вытворчасці тэхнікі. «Трэба выходзіць на сваё», — падкрэсліў беларускі лідар.

Акрамя тэхнікі і абсталявання ваеннага прызначэння Прэзідэнту прадэманстравалі і тую, якая можа быць выкарыстана ў грамадзянскіх мэтах, у тым ліку лічбавы тэлевізійны перадатчык эфірнага вяшчання, тэрмінал сувязі для лакаматываў, абсталяванне для энергасістэм, оптыку, метэаралагічнае абсталяванне.

У ходзе наведвання ААТ «Пеленг» таксама была ўзнята такая праблема, як скрыты імпарт. На думку аднаго з кіраўнікоў прадпрыемстваў, цяпер даволі проста арганізаваць у краіне зборку фактычна імпартных тэхнікі і абсталявання, а потым прадаваць іх на ўнутраным рынку пад маркай «Зроблена ў Беларусі», выкарыстоўваючы пры гэтым усе адпаведныя перавагі. Кіраўнік дзяржавы даручыў вывучыць гэту праблему на прадмет неабходнасці ўнясення змяненняў у нарматыўна-прававую базу.

Асобна Прэзідэнт азнаёміўся з навукаёмістай прадукцыяй і абсталяваннем, што выпрацоўваюцца арганізацыямі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. У тым ліку яму прадэманстравалі станок для фінішнага паліравання аптычных і паўправадніковых паверхняў, розныя віды новых матэрыялаў, абсталяванне для фігурнага раскрою ліставога металу, далажылі аб распрацоўках сучасных святлодыёдных і плазменных свяцілень. «Я так разумею, што Акадэмію навук можна здымаць з бюджэтнага фінансавання, даваць грошы толькі пад канкрэтныя праекты», — зрабіў вывад Аляксандр Лукашэнка пасля агляду экспазіцыі.

Кіраўнік дзяржавы таксама агледзеў будынак новага корпуса па зборцы і выпрабаваннях касмічнай тэхнікі ААТ «Пеленг», азнаёміўся з тэхналагічным абсталяваннем участка і працэсам зборкі гэтай тэхнікі. Аляксандру Лукашэнку прадэманстравалі баракамеру для правядзення выпрабаванняў, у якой імітуюцца касмічныя ўмовы. Як далажыў Прэзідэнту генеральны дырэктар ААТ «Пеленг» Уладзімір Пакрышкін, прадпрыемства працуе эфектыўна. Тэмп росту ў 2010 годзе ў параўнанні з узроўнем 2009-га склаў 145 працэнтаў, а ў 2011 чакаецца, што гэты паказчык перавысіць 150 працэнтаў. Партфель заказаў на 2012 год ужо цалкам сфарміраваны. Ёсць заказы аж да 2017 года. У стварэнні касмічных сістэм прадпрыемства актыўна супрацоўнічае з такімі краінамі, як Кітай і Расія, 95 працэнтаў выпрабленай прадукцыі адпраўляецца на экспарт.

Тэхналагічная база ААТ «Пеленг» забяспечвае ўсе асноўныя тэхналагічныя працэсы, неабходныя для распрацоўкі і вытворчасці навукаёмістых оптыка-электронных прыбораў. У 2011 годзе прадпрыемства ўключана ў рэестр высокатэхналагічных вытворчасцяў і прадпрыемстваў Беларусі.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## ДЭВАЛЬВАЦЫЯ НЕ ПРЫВЯДЗЕ ДА АЎТАМАТЫЧНАГА РОСТУ ЦЭН

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Мы ўсе хочам атрымліваць значна больш высокія зарплаты, а з чаго яны возьмуцца, калі бізнэс не заплаціць падаткі ад сваёй эфектыўнай работы, а дзяржава потым незможа пераразмеркаваць іх у бюджэт?» — звярнуўся з пытаннем віцэ-прэм'ер да членаў Нацыянальнага савета. Ён падкрэсліў, што сёння нельга дапусціць узнікнення спіралі «інфляцыя — дэвальвацыя». Нельга дапусціць, каб пасля павышэння цэн павышаліся заработныя платы, «людзі на павышаныя зарплаты куплялі тавары, валюту, а потым зноў павысяцца цэны, і зноў трэба павышаць заработную плату». Такога працэсу дапусціць нельга, падкрэсліў віцэ-прэм'ер. У гэты складаны перыяд, лічыць ён, трэба пацярпець. Сёння неабходна даць упэўненасць усім удзельнікам рынку, людзям, прадпрыемствам, што ва ўрада ёсць воля стрымаць гэтыя працэсы.

Сяргей Румас прызнаў, што рашэнне аб выхадзе на адзіны курс беларускага рубля давалася вельмі цяжка. Было шмат праціўнікаў гэтага нават ва ўрадзе і ў Нацыянальным банку. «Але мы зрабілі гэта і, паверце, курс будзе ўмацоўвацца», — лічыць ён. Пакуль цяжка сказаць да якога ўзроўню, але на гэтым узроўні, які цяпер склаўся, ён не застанецца, упэўнены віцэ-прэм'ер. «Далей усё будзе залежаць ад таго, як мы будзем працаваць», — сказаў ён. Тут зноў нельга дапусціць таго, каб «па-ранейшаму друкаваліся грошы для будаўніцтва жылля». Паводле яго слоў, уся краіна за жыллё заплаціла дэвальвацыяй. «Хтосьці атрымаў кватэру, а ў кагосьці абясцэніўся ўклад», — канстатаваў віцэ-прэм'ер.

У цэлым віцэ-прэм'ер лічыць, што інфляцыя ў Беларусі «гэта ганьба для ўрада, таму мы цалкам усведамляем адказнасць за сітуацыю, якая ёсць, і бачым прычыны, што прывялі да яе». Цяпер урад стараецца выправіць гэту сітуацыю, падкрэсліў ён. У бліжэйшы час плануецца аднавіць дзейнасць інфармацыйных груп для таго, каб наведваць прадпрыемствы, праводзіць сустрэчы з працоўнымі калектывамі і з першых вуснаў даведацца аб сітуацыі на месцах, старацца растлумачыць людзям тыя дзеянні, якія робяцца.

## БЕЛАРУСЬ ПАДНЯЛАСЯ НА 22 ПАЗІЦЫІ Ў РЭЙТЫНГУ «DOING BUSINESS 2012»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Найбольшы прагрэс наша краіна за апошні год (у рэйтынгу улічваюцца змены ў заканадаўстве, зробленыя за перыяд з чэрвеня 2010 па май 2011 года) зрабіла ў такім паказчыку, як «Абарона інвестара» — тут Беларусь паднялася на цэлых 29 пазіцый: з 108 на 79 месца. Трохі меншы рывок мы зрабілі ў паказчыку «Падаткаабкладанне» — Беларусь нарэшце зрушылася з леташняга апошняга месца і паднялася на 27 пазіцый да 156 месца. На 16 пазіцый прасунулася наперад Беларусь і па такім паказчыку, як «Ліквідацыя кампаніі» — з 98 на 82 месца.

На адну пазіцыю вышэй мы перайшлі і па такім паказчыку, як «Атрыманне дазволаў на будаўніцтва» — з 45 на 44 месца. А вось па «Рэгістрацыі ўласнасці» наша краіна выйшла на 4 месца ў свеце, падняўшыся за год на дзве пазіцыі (раней былі на 6 месцы).

Паказчык «Міжнародны гандаль» у нас не змяніўся (152 месца), а вось, на жаль, па чатырох пазіцыях аўтары даклада зафіксавалі зніжэнне рэйтынгу Беларусі: на 1 пазіцыю ў нанава ўведзенай катэгорыі «Падключэнне да сістэмы электразабеспячэння» (з 174 на 175 месца), на 2 пазіцыі ў катэгорыях «Рэгістрацыя прадпрыемстваў» (з 7 месяца на 9) і «Крэдытаванне» (з 96 на 98 месца), на 3 пазіцыі ў катэгорыі «Забеспячэнне выканання кантрактаў».

Цікава, што ў параўнанні са сваімі суседзямі Беларусь у рэйтынгу «Вядзенне бізнэсу-2012» выглядае даволі добра, бо Расія апынулася толькі на 120 месцы (паміж краінамі Каба-Вэрдэ і Коста-Рыкай; летась Расія была на 124 месцы), Украіна — на 152 месцы (а год назад была 149-й). А вось заходнім суседзям мы пакуль прайграём: Латвія займае ў рэйтынгу 21 месца (паднялася за год на 10 пазіцый), Літва — 27 месца (апусцілася на 2 пазіцыі), Польшча — 62 месца (апусцілася на 3 пазіцыі). Казахстан, з якім мы знаходзімся ў Мытным саюзе, займае ў рэйтынгу «Вядзенне бізнэсу-2012» 47 месца, падняўшыся за год на 11 пазіцый.

Варта таксама адзначыць, што наша краіна, на думку аўтараў даклада, увайшла ў тройку найбольш вядучых рэфарматараў у свеце (па сукупным эфекце ад паляпшэння ўмоў вядзення бізнэсу з 2005 па 2011 год), прапусціўшы наперад Грузію і Руанду.

Напрыканцы трэба сказаць, што ТОП-5 краін рэйтынгу «Doing Business 2012» у параўнанні з «Doing Business 2011» не змяніўся: першае месца па-ранейшаму належыць Сінгапуру, другое — Ганконгу, трэцяе — Новай Зеландыі, чацвёртае — ЗША, пятае — Даніі.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

## Хакей. КХЛ

### «ДЫНАМА» ПЕРАМАГЛО ЎЛАДАЛЬНІКА КУБКА ГАГАРЫНА

**Хакеісты мінскага «Дынама» з лікам 5:3 у гасцях абыгралі ўфімскі «Салават Юлаеў», каманду — уладальніцу Кубка Гагарына, галоўнага трафея Кантынентальнай хакейнай лігі.**

У другім перыядзе каманда Марэка Сікоры вяла 3:0, але дазволіла суперніку зраўняць лік. Але гульцы нашай каманды зноў праявілі характар і давялі да перамогі чарговы выязны матч. Пасля 16 гульняў «Дынама» займае з 23 ачкамі другое месца ў Заходняй канферэнцыі.

**Ул. інф.**



### Информация о проведении аукциона без условий по продаже имущества, обращенного в доход государства

| | |
|---|---|
| **Адрес объекта и его наименование** | Здание гаража для автомашин. Общая площадь 339 кв.м, год постройки 1968. Объект расположен по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Замковая, 19. Инв. № 200293 состоит из пяти обособленных помещений, стены кирпичные, кровля рулонная, совмещенная. **Начальная цена: 202 900 000 белорусских рублей.** Шаг аукциона в размере 5% от предыдущей цены. |
| **Порядок оплаты** | Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) в течение 2 месяцев и 25 дней на р/с СИКУП «УКС-Сервис» |
| **Сумма задатка** | 10 % от начальной цены на р/с 3012190930030 в отделении 932 ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно, код 739, УНН 600182305, ОКПО 04064333, получатель: СИКУП «УКС-Сервис» |
| **Продавец** | Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства при Молодечненском райисполкоме |
| **Организатор аукциона** | СИКУП «УКС-Сервис» |
| **Документы, представляемые для участия в аукционе** | Заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; юридическим лицам – копию учредительных документов и свидетельства о регистрации, индивидуальным предпринимателям – свидетельство о государственной регистрации, физическим лицам – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. |
| **Конечный срок и адрес приема заявок** | **21.11.2011 г. до 16.00,** г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1, СИКУП «УКС-Сервис», тел.: (8 0176) 73 00 13, (факс) 75 19 20, 8 044 710 74 60 |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **22.11.2011 г. в 15.00,** г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1. СИКУП «УКС-Сервис» |

**КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» информирует, что с аукционных торгов по продаже земельных участков в частную собственность в г. Бресте, назначенных на 28 октября 2011 г., снимается**

лот № 1 – земельный участок, расположенный по ул. Немцевича, 1,
лот № 2 – земельный участок, расположенный по ул. Немцевича, 1/1,
лот № 3 – земельный участок, расположенный по ул. Н. Орды, 1/1.

**Дополнительная информация по тел.: 23 81 92, 23 18 13.**



## Адзіны курс — Br8680 за $1

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У наступным годзе будзе ўведзена новая банкнота — 200 тысяч беларускіх рублёў. А з 10 і 20-рублёвымі купюрамі мы, хутчэй за ўсё, развітаемся: «Мы ўнеслі прапанову ва ўрад наконт таго, каб цэны акругляліся толькі ў межах 50 рублёў. І ўжо заказалі купюру ў 200 тысяч беларускіх рублёў. Спадзяёмся, што ў пачатку наступнага года яна ўжо з'явіцца ў абарачэнні». Дарэчы, намаляваны на купюры будуць архітэктурныя збудаванні Беларусі.

### *Дэнамінацыі не чакаецца*

«Сёлета яе не будзе», — лічыць кіраўнік Нацбанка. Што тычыцца курсу долара на пачатку наступнага года, то ў галоўным банку краіны ён прагназуецца на ўзроўні 7-8 тысяч беларускіх рублёў. Увогуле, Надзея Ермакова выказала ўпэўненасць, што беларускі рубель будзе ўзмацняцца. Аднак не выключана, што калі-нікалі ягоны курс будзе трошкі падаць. Гэта можа быць звязана з тым, што ў прадпрыемстваў (асноўных удзельнікаў таргоў на біржы) увесь час змяняецца патрэбнасць у беларускіх рублях (для выплаты заробкаў, падаткаў і іншых разлікаў), а таму прапанова можа вагацца. Тая ж сітуацыя і з попытам.

Надзея Ермакова таксама падзялілася сваімі думкамі наконт інфляцыі: «Нацыянальны банк будзе змагацца з ёю не адзін, таму што толькі манетарнымі метадамі ці выхадам на адзіны курс інфляцыю пераадолець немагчыма. Бо яна залежыць і ад таго, наколькі эфектыўна працуе наша эканоміка». Для яе збалансаванасці галоўны банкір Беларусі параіла беларусам, вобразна кажучы, зацягнуць паясы: «У наступным годзе нам прыйдзецца жыць у вельмі сціплых умовах крэдытавання». Нацбанк ужо змагаецца з ростам крэдытаў — павялічвае пастаянна стаўку рэфінансавання. Ці будзе яна павялічвацца надалей, пакуль невядома. «Гэта будзе залежаць ад росту крэдытоарскай запазычанасці», — заявіла Надзея Ермакова.

Старшыня Нацбанка агучыла прагноз па інфляцыі на наступны год: Надзея Ермакова лічыць, што яна не будзе большай за 20 працэнтаў.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

## 1600 КІЛАМЕТРАЎ — НЕ ПРАБЛЕМА ДЛЯ БЕЛАРУСКІХ СУВЯЗІСТАЎ

### *Беларускія ваенныя сувязісты святкуюць свой 92-і юбілей*



